УДК 291.23:94(476) “16/17”

# ТАНАТАЛАГІЧНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ КАЛЬВІНІСТАЎ І ІХ РЭАЛІЗАЦЫЯ Ў РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У СЯРЭДЗІНЕ XVI – XVII ст.

**Стахно Ніна Валер’еўна,**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*Даклад прысвечаны аналізу ўяўленняў кальвіністаў пра смерць і патойбаковым лёсе душы, праблеме веры ў прадвызначэнне, а таксама адлюстраванню дадзеных уяўленняў у пратэстанцкай фунеральнай культуры іх уплыву на арганізацыю падтрыхтоўкі чалавека да смерці.*

На тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага ў 1520–50-я гг. прыходзіць Рэфармацыя, як рух, накіраваны супраць узбагачэння і росту ўплыву каталіцкай царквы. На нашых тэрыторыях найбольшае распаўсюджанне атрымаў кальвінізм. Ён адрозніваўся ад каталіцызму як у частцы дагматыкі, так і ў абрадах. Звернем увагу на асаблівасці танаталагічных уяўленняў дадзенай канфесіі.

Кальвіністы адкладалі канчатковае рашэнне лёсу чалавечай душы да Страшнага суда. Пасля смерці душа апынялася ў своеасаблівым стане блажэннага сна. Ніякага трэцяга месца, чысца, дзе мажліва было пакутай выкупіць усе свае грахі не прапаноўвалася. Адметным момантам эсхаталогіі кальвіністаў з’яўлялася вучэнне аб прадвызначэнні. Згодна з ім лёс душы быў вядомы яшчэ ад часу яе стварэння: Бог загадзя вызначыў, якая з чалавечых душ атрымае выратаванне і трапіць у рай, а якую чакаюць вечныя пакуты ў пекле. Яго волю не маглі змяніць ні Ён сам, ні людзі сваімі дзеяннямі. Менавіта таму кальвіністы не ўжывалі меры для таго, каб дапамагчы душы наблізіцца да Бога, у той час як католікі і праваслаўныя актыўна выкарыстоўвалі малітвы за выратаванне душы памерлага, дабрачынную і фундатарскую дзейнасць. Зноў жа, тэстамент у кальвіністаў не выступае «квітком» на нябёсы, а скіраваны ў першую чаргу на забеспячэнне матэрыяльнага дабрабыту сям’і, пазбяганне спрэчак звязаных з успадкоўваннем маёмасці і выкананне распараджэнняў па распаўсюджанні і падтрыманні пратэстантызму. Акрамя таго, менавіта з-за веры ў прадвызначэнне мы не знаходзім зваротаў да святых і Маці Божай за заступніцтвам перад Богам у актах апошняй волі кальвіністаў. Сваім галоўным заступнікам і дабрадзеем яны лічылі Бога. То бок, Бог у іх паўстае як істота добрая, якая апекаецца імі [1, s. 90].

Згодна з вераваннямі кальвіністаў, чалавек ніколі дакладна не ведаў свайго лёсу, ён мог толькі здагадвацца пра гэта па ўскосных прыкметах, якімі былі поспех у спра-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вах, дабрабыт і г. д. У той жа час, трэба было быць упэўненым у сваёй выбранасці і ўвесь час гэта даказваць. Таму кальвіністы хавалі сваіх памерлых з поўнай верай у іх шчаслівае ўваскарасенне. Сам чалавек павінен быў прымаць смерць без скрухі і непатрэбных рухаў. Напрыклад, пры апісанні смерці Януша Радзівіла 7 лістапада 1620 г. адзначаецца, што ён дайшоў да смерці спакойна і без розных рухаў, накшталт нейкага паміраючага дзіцяці аддаў Богу душу [2, s. 45].

Агенды, якія рэгулявалі пратэстанцкія рэлігійныя практыкі, апісвалі наступны ход пахавання. Усе, хто збіраўся вакол памерлага, павінны былі спяваць песні і псалмы і жадаць сабе такой жа долі, бо ўсе верылі ў дасягненне чалавекам збавення [3]. Дзякуючы сумеснаму спяванню пастулявалася не толькі пакора волі Божай і ўсхваленне Бога, але дэманстравалася і еднасць кальвінскай супольнасці перад тварам смерці [4, s. 44]. Зранку каля цела святары павінны былі чытаць малітвы і павучэнні, далей перад пахаваннем рабілася казанне. Асноўная розніца паміж каталіцкімі і кальвінісцкімі казаннямі – гэта ўвага да асобы памерлага – у першых ёй прызначаецца нашмат больш месца, у той час як у казаннях кальвінісцкіх прапаведнікаў значна больш месца адводзіцца дактрыне. Потым, пры пераносе цела зноўку спявалі песні ці псалмы, а непасрэдна перад пахаваннем цела ў зямлю таксама маглі прачытаць казанне. Пасля пахавання сям'я дзякавала ўсім прысутным, адорвала ўбогіх, спявалі песні і разыходзіліся. Усе прапаведнікі ды і самі вернікі прасілі хаваць іх без пампезных тэатралізаваных відовішчаў, якія рабілі католікі і якія высмейвалі пратэстанты [5, s. 170].

Але часта дадзеныя патрабаванні заставаліся толькі на паперы. Асабліва пышныя пахаванні ў асяроддзі пратэстантаў распаўсюдзіліся ў сярэдзіне XVII ст. Прыкладам можа стаць пахаванне Крыштафа Радзівіла ў 1640 г., якое працягвалася ажно тыдзень. Цела спачатку было выстаўлена ў прыгожа дэкараванай залі, абітай чорным аксамітам, быў пабудаваны некалькіступенёвы катафалк, упрыгожаны залатымі элементамі, з чатырох кутоў катафалка тырчалі чатыры гусарскія гетманскія харугві, якія служылі ў інфлянцкіх і маскоўскіх выправах [6, s. 6]. Штодня з ночы да ранку і з ранку да ночы над памерлым адбываліся імшы, малітвы, вакальныя спевы [6, s. 9].

Перанос цела ў збор сабраў вялізарную колькасць людзей і ўтрымліваў тэатралізаваныя элементы. Галоўным з іх быў архімімус – чалавек, які ўвасабляў вобраз памерлага чалавека – у адзенні князя і на кані, якога князь найбольш выкарыстоўваў пры жыцці. Ён надзвычайна быў падобны да князя, што ўсіх вельмі здзіўляла. Далей неслі гетманскія сімвалы – княжацкую шапку, булаву, шаблю. У зборы зладзілі традыцыйны для сармацкіх пахавальных цырымоній castrum doloris – замак жалю – часовы, багата ўпрыгожаны архітэктурны комплекс. Над ім лунаў штучны арол. Побач былі пабудаваны дзве пірамiды – на адной трафеі ад швецкай кампаніі, на другой – ад маскоўскай [6, s. 45].

Нягледзячы на тое, што ў сваім тэстаменце Крыштаф Радзівіл прасіў пра ціхае пахаванне без свецкай помпы [5, s. 145], аўтар апісання цырымоніі князя апраўдвае яго брата Януша, які арганізаваў надзвычайна пампатычнае пахаванне, тым, што гэта быў добры ўчынак і добры сродак ушанаваць памяць вялікага чалавека, сенатара і гетмана [6, s. 3-4].

Такім чынам, мы можам зрабіць наступную выснову. Кальвіністы мелі своеасаблівыя танаталагічныя ўяўленні, якія адрозніваліся ад каталіцкіх верай ў прадвызначэнне пасмяротнага лёсу душы, з-за чаго не мажліва было паўплываць на выратаванне праз малітвы і дабрачынную дзейнасць. А таксама ў адсутнасць чысца, дзе можна было б самастойна адпакутваць усе грахі. Па гэтай прычыне трэба было ўспрымаць смерць спакойна і з упэўненасцю ў збавенне, не просячы дапамогі ні ў блізкіх, ні ў святых. Усе ўсхваленні чалавека праз пахавальныя казанні і пампатычныя пахаванні асуджаліся прапаведнікамі. На паперы, вернікі таксама падтрымлівалі дадзены пасту-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лат, але на справе у XVII ст. пахаванне заможнага кальвініста мала чым адрознівалася ад пахавання яго каталіцкага суайчынніка. Такім чынам, мы можам адзначыць, што ў дадзены перыяд нягледзячы на дагматычныя асаблівасці адбываецца сарматызацыя фунеральнай культуры кальвіністаў Рэчы Паспалітай.

## Літаратура


1. Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD) – F. 354. Archiwum Radziwillow – Dział XI – 38 – Тэстамент Катажыны з Радзівілаў Глябовічавай.

2. Jarczykowa, M. Przy pogrzebach rzeczy i rytmy: Funeralia Radziwiłłowskie z XVII wieku / Mariola Jarczykowa. – Katowice : Uniwersytet Śląski, 2014. – 288 c.

3. Kraiński, K. Porządek Nabożeństwa Kościoła powszechnego Apostolskiego, Słowem Bożym ugruntowanego y zbudowanego na Jezusie Krystusie. Spisany ku chwale Bogu w Troycy iedynemu: Roku 1602. Przez Starsze Kościołów reformowa nych w Małey Polszcze, za radą y dozwoleniem Synodu Prouincialnego Ożarowskie- go y Włodzisławskiego. [Raków], 1602. – 171 c.

4. Nowicka-Jeżowa, A. Pieśni czasu śmierci: studium z historii duchowości XVI—XVIII wieku / Alina Nowicka-Jeżowa. – Lublin : Towarzystwo Naukowe Katolickiego Uniwersytetu Lubelskiego, 1992. – 478 c.

5. Augustyniak, U. Testamenty ewangelików reformowanych w Wielkim Księstwie Litewskim / Urszula Augustyniak. – Warszawa : Semper, 1992. – 250 c.

6. Kmita, J. A. Process pogrzebu śp. J. Ośw. X. JMci na Birżach i Dubinkach P. P. Krzysztofa Radziwiłła wojewody wilenskiego, hetmana wielkiego W. Ks. L., administratora mohilewskiego, bystrzyckiego starosty. – Lubiecz : Drukarnia J. Kmity, 1641.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова